

**Мулявін як легенда і герой спектакля**

СТАР. 3



**Небяспека «транзітнага» шлюбу**

СТАР. 5



**Антыкавярні: не «супраць», а «за» кліента**

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 КАСТРЫЧНІКА 2014 г. СУБОТА № 194 (27804) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# САДРУЖНАСЦЬ ДЫЯЛОГУ І ПАРАЗУМЕННЯ

## Унікальнае палітычнае ўтварэнне, якое аб'ядноўвае краіны постсавецкай прасторы, трэба захоўваць і развіваць

**Беларусь чарговы раз пацвердзіла статус універсальнай, вельмі зручнай і камфортнай пляцоўкі, на якой ажыццяўляюцца многія інтэграцыйныя мерапрыемствы і ўмацоўваецца ўзаемадзеянне ў СНД. Гэтыя словы старшыні Выканаўчага камітэта — выканаўчага сакратара СНД Сяргея Лебедзева — найлепшае адлюстраванне атмасферы, у якой праходзіла ўчора ў Мінску пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД.**

Ужо падводзячы вынікі саміту, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што былі падрабязна абмеркаваны канцэптуальныя пытанні, праблемы і перспектывы развіцця Садружнасці. «Праведзеная размова чарговы раз пацвердзіла нашу гатоўнасць да канструктыўнага супрацоўніцтва і ўзаемаразумення», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

У ходзе пасяджэння Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на самыя болевыя кропкі Садружнасці. У прыватнасці, на дэзінтэграцыйныя тэндэнцыі, якія ўзмацняюцца ўнутры СНД. Па словах беларускага Прэзідэнта, «гэта не можа не насцярожваць. Асабліва з улікам спроб асобных добразычліўцаў пахаваць СНД як непатрэбны рудымент. Беларусь не з'яўляецца прыхільніцай такога песімістычнага падыходу. Мы заўсёды выступалі за развіццё ўсебаковага супрацоўніцтва». Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, менавіта таму Беларусь паўторна ўзяла на сябе старшынства ў СНД сёлета.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што гісторыя інтэграцыйных працэсаў на постсавецкай прасторы пачалася менавіта з СНД. «СНД — гэта падмурак, які фарміруе ўмовы і вызначае зацікаўленасць кожнай краіны ў ступені інтэграцыі», — адзначыў беларускі лідар. Ён дадаў, што вопыт СНД актыўна выкарыстоўваецца ва ўсіх іншых арганізацыях, створаных на постсавецкай прасторы. На думку Прэзідэнта Беларусі, прысутнасць на пасяджэнні амаль усіх кіраўнікоў дзяржаў СНД красамоўна пацвярджае жыццяздольнасць Садружнасці. «Нам усім неабходна такая платформа, якая аб'ядноўвае. Тут няма абыякавых. Надышоў час адкрыта, па-мужчынску пагаварыць пра далейшы лёс Садружнасці», — сказаў беларускі кіраўнік.

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.

*ЛІЧБА ДНЯ*

**На 7,2%,**

***як і ў папярэднім месяцы, індэксуецца ў Беларусі мінімальная заработная плата (МЗП) за верасень. Гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэн за верасень не перавысіў пяціпрацэнтны парог да месяца папярэдняй індэксацыі (май 2014 года), паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Такім чынам, месячная мінімальная заработная плата за сёлетні верасень складае Br1 млн 756 тыс. 730. З 1 студзеня 2014 года, згодна з пастановай Савета Міністраў, месячная мінімальная заработная плата была ўстаноўлена ў памеры Br1 млн 660 тыс.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.10.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10640,00 | ■ |
| Еўра | 13490,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 264,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 821,62 | ■ |

# СВАЯ НІША Ў СУСВЕТНЫМ ПАРАДКУ ДНЯ

## На карце свету сфарміраваўся новы магутны эканамічны цэнтр — ЕАЭС

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў, паведамляе БЕЛТА.**

«Сёння мы праводзім наша пасяджэнне ва ўмовах, калі Еўразійскі эканамічны саюз дэ-факта заняў сваю нішу ў сусветным эканамічным і нават палітычным парадку дня. Мы дэ-юрэ завяршаем фарміраванне найбуйнейшага агульнага рынку на еўразійскай прасторы», — сказаў беларускі лідар.




Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Беларусь, Казахстан і Расія праінфармавалі сусветную супольнасць аб практычна сінхроннай ратыфікацыі парламентамі краін Дагавора аб ЕАЭС, які ўступіць у сілу з 1 студзеня 2015 года.

Па выніках пасяджэння Міждзяржаўнага савета Еўразійскай эканамічнай супольнасці быў падпісаны дагавор аб спыненні дзейнасці ЕўрАзЭС. Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, ЕўрАзЭС годна выканала сваю ролю, пройдзены вялікі і складаны шлях інтэграцыйнага будаўніцтва. «Самае галоўнае, што ЕўрАзЭС з'явілася падмуркам для стварэння Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, якія, у сваю чаргу, заклалі асновы будучага Еўразійскага эканамічнага саюза, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Таму сённяшнія рашэнні аб змене фармату нашага ўзаемадзеяння — гэта адэкватнае адлюстраванне сучасных тэндэнцый інтэграцыі».

А ЕАЭС учора фактычна пашырыў свае межы: быў падпісаны дагавор аб далучэнні да саюза Арменіі. Як заявіў Прэзідэнт гэтай краіны Серж Саргсян, адсутнасць у Арменіі агульных межаў з членамі ЕАЭС не перашкодзіць інтэграцыі. Да канца 2014 далучыцца да Дагавора аб ЕАЭС разлічвае Кыргызстан, заявіў кіраўнік гэтай дзяржавы Алмазбек Атамбаеў.

■ Быт ці не быт?

# ГАРАЖНЫЯ СТА СТАЛІЦЫ НЕ ІМКНУЦЦА ДА ЛЕГАЛІЗАЦЫІ?

## ЗА СЕМ МЕСЯЦАЎ 2014 ГОДА Ў КРАІНЕ ВЫЯЎЛЕНА 118 ПАРУШАЛЬНІКАЎ

**Пра сітуацыю з падпольнымі гаражнымі СТА паведаміла <u>начальнік упраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва Міністэрства гандлю Валянціна ЛЯЎКОЎСКАЯ.</u>**

### Дзяржава атрымала 500 мільёнаў

«Пасля таго як летась уладальнікам майстэрняў, размешчаных на тэрыторыі гаражных кааператываў, дазволілі аказваць паслугі па тэхнічным абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў, парушальнікаў, вядома, прыкметна стала менш, — адзначыла Валянціна Ляўкоўская. — Аднак выпадкі нядобрасумленнага аказання паслуг аўтасэрвісу выяўляюцца. Пры гэтым вінаватыя нясуць адказнасць». Колькасць тых, хто працуе легальна, паступова расце. Цяпер на тэрыторыі Беларусі зарэгістравана ўжо 211 індывідуальных прадпрымальнікаў, якія аказваюць паслугі аўтасэрвісу ў гаражных кааператывах. Найбольшая колькасць гаражных СТА зарэгістравана ў Гомельскай вобласці (85), менш за ўсё у Мінску (9).

Пры гэтым, па словах прадстаўніка міністэрства, арганізацый аўтасэрвісу ў Мінску больш за ўсё, а ў Гомельскай вобласці — менш. Не можа быць, каб у сталіцы было так мала гаражных СТА. Значыць усе яны застаюцца ў цені? «Мы не можам гэта выключыць, але і сцвярджаць падобнае таксама нельга. Аднак такія меркаванні ёсць», — адказала Валянціна Ляўкоўская на пытанне карэспандэнта «Звязды».

Разам з тым, вывад з ценю часткі прадстаўнікоў гэтай сферы становўча адбіўся на якасці аказваемых паслуг і ўзроўні бяспекі на дарогах. Дарэчы, падатковыя паступленні ад гаражных СТА за 7 месяцаў склалі 500 млн рублёў. Нагадаем, што аказваць паслугі па тэхнічным абслугоўванні і рамонце транспартных сродкаў у майстэрнях, размешчаных на тэрыторыі гаражных кааператываў, у Беларусі дазволена з 1 лістапада 2013 года.

### Усе ў рэестр!

Ёсць яшчэ важная падзея ў сферы бытавых паслуг. У Беларусі з 1 чэрвеня 2015 года забароняць дзейнасць не ўключаных у адпаведны рэестр суб'ектаў гаспадарання (юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў), што аказваюць бытавыя паслугі.

СТАР. 4



Фота Надзеі БУЖАН.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Кітай выцесніў ЗША з першага месца па памеры эканомікі



Валавы ўнутраны прадукт Кітая па парытэце пакупніцкай здольнасці склаў $17,632 трыльёна супраць $17,416 трыльёна ў ЗША. Пра гэта паведамляе Міжнародны валютны фонд. Такім чынам, кітайская эканоміка ўпершыню абышла амерыканскую па памеры эканомікі. Паводле ацэнак МВФ, у наступным годзе адрыў Кітая ад ЗША павялічыцца амаль да трыльёна долараў: яго ВУП па парытэце пакупніцкай здольнасці складзе $19,230 трыльёна супраць $18,286 трыльёна ў ЗША. Пры гэтым ЗША застаюцца бясспрэчным сусветным лідарам па памеры ВУП у бягучых цэнах ($16,8 трыльёна), істотна апярэджваючы Кітай ($10,4 трыльёна).




### Расійскія школьнікі пачнуць здаваць нормы ГПА ў 2015 годзе

У 2015 годзе плануецца ў поўным аб'ёме адрадзіць у школах здачу нарматываў ГПА («гатовы да працы і абароны»). Такую заяву зрабіў кіраўнік мінспорту Расіі Віталь Мутко, выступаючы на пасяджэнні прэзідэнцкага савета па развіцці фізкультуры і спорту. «Сёлета ў сістэме адукацыі мы пачнём рэалізацыю гэтага праекта. У наступным годзе — усе школы, а праз год — уся краіна, мы ўсе пяройдзем на комплекс ГПА», — заявіў Мутко. Пакуль, па словах міністра, толькі 12 рэгіёнаў атрымалі права пачаць рэалізацыю гэтага праекта.

### Вытворчасць каньяку і шампанскага ў Малдове скарацілася ўдвая

У Малдове вытворчасць каньяку і шампанскага скарацілася ўдвая на фоне ўведзенай раней Расіяй забароны на пастаўкі вінаробнай прадукцыі на расійскі рынак, які быў для рэспублікі асноўным. Паводле звестак Нацыянальнага бюро статыстыкі, у І паўгоддзі 2014 года ў параўнанні з тым жа перыядам летась вытворчасць каньяку ў Малдове скарацілася на 55,5%. За той жа перыяд выпуск пеністага (шампанскага) віна паменшыўся на 53,5% да 88,2 тыс. дэкалітраў, а вытворчасць натуральнага вінаграднага віна знізілася на 22,7% да 4 млн 225 тыс. дал. Вытворчасць партвейну, мадэры, шэры (херасу), такайскага віна ў студзені-чэрвені 2014 скарацілася на 50,1%.

ISSN 1990 - 763X

14194>

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Адвар бружмелю здольны паставіць на ногі пры грыпе

Падчас запарвання бружмелю вылучаюцца малекулы, якія дапамагаюць змагацца з вірусам грыпу, піша The Telegraph. Эксперыменты з мышамі паказалі: такі напой можа быць эфектыўным супраць некалькіх штамаў грыпу, якія ў апошнія гады нярэдка траплялі ў цэнтр увагі медыкаў і СМІ.



У іх ліку H1N1 і птушыны грып H5N1. Навукоўцы Нанкінскага ўніверсітэта Кітая параўноўваюць напой з «пеніцылінам для вірусаў». Трэба сказаць, што адвар бружмелю на працягу стагоддзяў п'юць у Кітаі менавіта для лячэння грыпу. Даследаванне даказвае правільнасць такога падыходу. Сакрэт крыецца ў малекуле MIR 2911. Яна пранікае ў крывацёк, тканкі лёгкіх і прыгнятае актыўнасць вірусу. Адбываецца гэта за кошт блакавання двух генаў, якія вірусы выкарыстоўваюць для размнажэння.

КОРАТКА

Нобелеўскую прэмію міру прысудзілі Малалы Юсуфзай з Пакістана і Кайлаш Сат'яртхі з Індыі. Малала Юсуфзай вядомая ў свеце як змагар за правы жанчын на адукацыю. Кайлаш Сат'яртхі — актывіст з Індыі, які абараняе правы дзяцей.

**Тыдзень бязвыплатнага донарства пройдзе ў Мінску 13–19 кастрычніка. На працягу гэтага часу кадравыя донары і ўсе жадаючыя змогуць бязвыплатна падзяліцца плазмай крыві. Бяруць кампаненты крыві апаратным метадам.**

У склад журы конкурсу фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі «Лістападзік-2014» увайшлі Яўген Руман (Ізраіль), Яана Пылдма (Эстонія) і Вера Кавалерава (Беларусь).

**У сувязі з правядзеннем фінальнага этапу рэспубліканскай акцыі «Спартсмены — за бяспеку дарожнага руху!» з 9 да 17 гадзін 12 кастрычніка будзе закрыты рух транспарту на ўчастку дарогі паміж вуліцамі Леніна і Кастрычніцкай.**




# «ТАНЦАВАЦЬ» АД ПЕЧЫ

## ЯКІЯ ПЫТАННІ ЗАДАЮЦЬ ВЫРАТАВАЛЬНІКІ ПАДЧАС ПАЖАРНА-ПРАФІЛАКТЫЧНАЙ АКЦЫІ

**Па ўсёй краіне ў кастрычніку супрацоўнікі МНС прыходзяць у жылыя дамы. Яны не толькі правяраюць, наколькі падрыхтавана жытло да халоднага сезона, але і дапамагаюць гаспадарам ва ўстаноўцы аўтаномных пажарных апавяшчальнікаў. У адзін такі рэйд адправіліся і карэспандэнты «Звязды».**



**Віктар МАСЦЯНІЦА правярае пажарны шчыт.**

Фота Любові БЯЛЯЕВАЙ.

### «Прэтэнзій да стану інтэрната няма»

— Дзень добры! Проціпажарная праверка! — з гэтых слоў **першага намесніка начальніка Смалявіцкага РАНС Віктара МАСЦЯНІЦЫ** пачынаецца прафілактычны абход па інтэрнаце ПУП «Азярыцкі-Агра», што знаходзіцца ў аграгарадку Азярыцкая Слабада. — Калі ў апошні раз правяраліся веды жыхароў інтэрната аб тым, што рабіць у выпадку надзвычайнай сітуацыі?

— Да нас у жніўні прыязджаў супрацоўнік з МНС, — адказвае **загадчык інтэрната Фёдар МІГУН.** — З яго дапамогай мы праводзілі, хутчэй, не столькі тэарэтычную праверку, колькі заняткі па вывадзе людзей на вуліцу згодна з планам эвакуацыі.

СТАР. 4